**В.А.Касап,** *кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# КАМУНІКАТЫЎНАЯ ПРЫРОДА І ФУНКЦЫІ НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫХ ДАКУМЕНТАЎ

Дакумент – камунікатыўны аб’ект па сваім паходжанні і мэтах існавання. У апублікаваных крыніцах адсутнічаюць адзіныя падыходы да вызначэння функцый дакументаў. Функцыі дакумента непасрэдна звязаны з функцыямі інфармацыі, якую ён змяшчае. Сацыяльная інфармацыя, размешчаная ў дакуменце, шматфункцыянальная, што можна транспанаваць і на сам дакумент. Функцыі ўплываюць на разнастайнасць відаў і падвідаў дакументаў, спрыяюць іх класіфікацыі.

Большасць аўтараў падзяляюць функцыі дакументаў на сутнасныя, якія ўласцівы ўсім дакументам і тыя, якія прысутнічаюць у дакументах выбарачна. Так, згодна Н.С.Ларкову [4], функцыі дакументаў – гэта іх мэтавае прызначэнне, спосаб выкарыстання. Ён падзяляе функцыі дакумента на сутнасныя і прыкладныя. Да першай групы функцый аўтар адносіць функцыі замацавання інфармацыі на матэрыяльным носьбіце, камунікатыўную, захавання інфармацыі, функцыю гістарычнай крыніцы, культурную. У межах канкрэтнай дзейнасці ён называе прыкладныя функцыі: кіравання, прававую, адукацыйную, палітычную і інш. Н.Б.Зіноўева [1] вылучае агульныя функцыі – сацыяльную, інфармацыйную, камунікатыўную, культурную. Да спецыяльных функцый дакументаў, на яе думку, адносяцца ўліковая, адукацыйная, кіравання, мемарыяльная і інш. Г.М.Швяцова-Водка [7] называе асноўную функцыю дакументаў – сацыяльна-камунікатыўна-інфармацыйную, якая вызначаецца месцам у сістэме сацыяльных камунікацый, дзе з’яўляецца каналам перадачы інфармацыі. Яна называе і іншыя функцыі, якія выконвае дакумент у пэўных камунікатыўных сітуацыях. Я.А.Пляшкевіч [5] падзяляе функцыі дакументаў на агульныя, характэрныя для ўсіх дакументаў, да якіх адносіць камунікатыўную, функцыю гістарычнай крыніцы і культурную, а таксама сістэмныя, характэрныя для дакументаў пэўных сістэм. Да іх аднесены функцыі: кіравання, прававая, пасведчання і інш.

Функцыю гістарычнай крыніцы, як сутнасную, можна аспрэчыць тым, што не кожны дакумент будзе яе выконваць. Таксама не ўсе

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

дакументы ўваходзяць у пэўныя сістэмы дакументацыі (арганізацыйна-распарадчую, фінансавую, планавую і інш.). Такім чынам, прапанаваныя аўтарам функцыі больш характэрны да архіўных і гістарычных крыніц.

Н.М.Кушнарэнка [3] падзяляе функцыі дакументаў на тры групы: *галоўная,* найбольш значная, – захаванне і перадача інфармацыі ў прасторы і часе; *асноўная* – інфармацыйная, камунікатыўная, кумулятыўная; *спецыяльная* – кіравання, пазнавальная, прававая, мемарыяльная і інш. Тут назіраецца, мяркуем, недастаткова распрацаваны крытэрый вызначэння функцый, бо функцыя перадачы інфармацыі, гэта і ёсць камунікатыўная, якая паўтарае адну з асноўных. Аднамерны пералік функцый дакументаў зроблены ў вучэбным дапаможніку [2], аўтары якога называюць функцыі дакументаў: памяці, камунікатыўная, інфармацыйная, прававая. Тут дакладна не вызначаецца ўласцівы гэтыя функцыі ўсёй сукупнасці дакументаў ці яны прадстаўлены выбарачна, каб прадэманстраваць наяўнасць гэтага атрыбута дакумента як сістэмнага аб'екта. Да таго ж прававая функцыя не можа выступаць як сутнасная, бо далёка не ўсім дакументам яна ўласціва.

З пункту гледжання тэорыі сацыяльнай камунікацыі [6] выдзяляюцца сутнасныя і прыкладныя функцыі дакументаў. У залежнасці ад сацыяльнага прызначэння да сутнасных аднесены камунікатыўна-часавая, камунікатыўна-прасторавая, каштоўнасна арыентаваная, а па спажывецкіх патрабаваннях – зместавая, разумення, рэчыўнасці дакумента. Прыкладныя функцыі падзелены па сацыяльным выкарыстанні (адукацыйная, ідэалагічная, бюракратычная і інш.) і асобасным выкарыстанні (пазнавальная, геданістычная, бібліяфільская і інш.). Інфармацыйная функцыя як сутнасная, прапанаваная некаторымі аўтарамі, на нашу думку, не можа выступаць ў гэтай якасці ў сувязі з тым, што наяўнасць зафіксаванай інфармацыі на матэрыяльным носьбіце з'яўляецца атрыбутыўнай прыметай дакумента. Што тычыцца выдзялення ў якасці сутнаснай функцыі каштоўнасна арыентаванай, то далёка не ва ўсіх дакументах прадугледжаны рэкамендацыі рэцыпіенту ці кантэкстныя падказкі. Да таго ж сама катэгорыя "каштоўнасць дакумента" патрабуе больш глыбокіх тлумачэнняў. Яе можна разумець як каштоўнасць зместу, афармлення, формы дакумента ў камунікатыўным працэсе.

Праведзены аналіз дазваляе канстатаваць, што сярод выдзеленых рознымі аўтарамі сутнасных функцый дакумента нязменна

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

прысутнічае камунікатыўная. Яна ўказвае на ролю дакумента ў камунікатыўным працэсе, на яго прыналежнасць да сістэмы сацыяльных камунікацый. Сапраўды, інфармацыя на матэрыяльным носьбіце фіксуецца камунікатыўнымі сродкамі – знакамі натуральнай, штучнай мовы, знакамі-пікчэрамі, умоўнымі абазначэннямі. Любы дакумент ствараецца для таго, каб пабудзіць атрымальніка на дзеянні ў адказ; такім чынам, заўсёды ёсць стваральнік інфармацыі і прадугледжаны верагодны ці рэальны яго рэцыпіент. Дакумент ствараецца як неабходны элемент камунікатыўнага ўзаемадзеяння камуніканта і рэцыпіента. Разнастайнасць знешніх функцый дакумента вызначаецца рознымі фактарамі, такімі, як сфера яго выкарыстання, тэматыка, знакавая прырода, мэта стварэння і інш. Выкарыстанне дакумента як сродку камунікацыі забяспечвае дзейнасны характар камунікатыўнага акта і яго дыялагічнасць.

Для дакументаў, якія фіксуюць навукова-тэхнічныя і прыкладныя веды, характэрны, такім чынам і агульныя сутнасныя функцыі (камунікатыўная, кумулятыўная, культурная) і прыкладныя, звязаныя са зместам і відамі канкрэтных дакументаў (напрыклад, афіцыйная для нарматыўна-тэхнічных дакументаў, інавацыйная і прававая для патэнтных і неапублікаваных дакументаў, рэкламная для прамысловых каталогаў і інш.).

Н.Б.Зіноўева адзначае, што існуе сувязь паміж відамі дакументаў, іх уласцівасцямі і функцыямі, якія яны выконваюць. Аб’яднанне дакументаў у пэўныя віды актуалізуе іх пэўныя ўласцівасці, якія пры выкарыстанні пераўтвараюцца ў функцыі [1]. У выніку прыстасавання да выканання пэўных функцый дакументы набываюць якасныя адрозненні, што выражаецца асаблівасцямі мовы, структуры, зместу, выбарам спосабу дакументавання.

Устаноўлена, што існуюць цесныя ўзаемасувязі паміж характарам камунікатыўнага акта (дыялогавы рэжым, нарматыўнасць, кіравання, сацыялізацыі, адаптацыі да асяроддзя, выкарыстання дасягненняў, узаемадзеяння культур і інш.) і існуючымі відамі і групамі дакументаў. Напрыклад, для камунікацыі дыялогавага характару ў вытворчай сферы найбольш падыходзяць практычныя інструкцыі, памяткі, сертыфікаты якасці тавараў і паслуг. Для ажыццяўлення камунікатыўнага акта нарматыўнага характару прыстасаваны нарматыўна-тэхнічныя дакументы (стандарты, тэхнічныя ўмовы, тэхнічныя рэгламенты, будаўнічыя нормы і патрабаванні). Камунікацыя ў дапамогу сацыялізацыі асобы

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

ажыццяўляецца пад уздзеяннем практычных настаўленняў, дакументальна-мастацкіх выданняў, вучэбнай літаратуры, навукова-пазнавальных дакументаў. Міжкультурная камунікацыя і ўзаемадзеянне культур адбываюцца шляхам выкарыстання арыгінальнай і перакладной літаратуры аўтараў – носьбітаў іншай культуры і мовы з мэтай узбагачэння ўласнага дыскурсу рэцыпіента. Ажыццяўленне камунікацыі дзеля выкарыстання дасягненняў паспяхова ідзе з дапамогай патэнтных дакументаў, у тым ліку ліцэнзійных пагадненняў, навукова-папулярнай літаратуры, прамысловых каталогаў і інш.

Навукова-тэхнічныя дакументы маюць свае адметныя ўласцівасці, якія ўплываюць на сферу вытворчай і навуковай камунікацыі. Сярод іх такія, як: асаблівасць сацыяльнага прызначэння дакументаў, якая заключаецца у тым, што яны садзейнічаюць развіццю прагрэсу ў навукова-тэхнічнай сферы; інтэрнацыянальная прырода дакументаў вызначаецца тым, што вусная, дакументная і электронная камунікацыі ў навукова-тэхнічнай сферы звязаны з перадачай паведамлення, каштоўнасць якога не залежыць ад моўных, геаграфічных, асобасных абмежаванняў; асаблівасці зместу і мовы навукова-тэхнічных дакументаў дэтэрмініраваны складанасцю саміх аб’ектаў навукі, метадаў і інструментарыя іх вывучэння, а таксама асаблівасцямі навуковай мовы (шырокім выкарыстаннем фармалізаваных моў, табліц, графікаў, схем і спецыяльнай тэрміналогіі).

Паспяховасць выкарыстання навукова-тэхнічных дакументаў залежыць ад пераадолення камунікатыўных бар’ераў, якія маюць спецыфічны характар праяўлення. Тэхнічны бар’ер, які звязаны з недаступнасцю дакумента, можа праяўляцца ў тым, што публічныя бібліятэкі не забяспечваюць доступ карыстальніка да патэнтных, нарматыўна-тэхнічных дакументаў, прамысловых каталогаў, а таксама што іх індэксаванне ажыццяўляецца згодна спецыяльных класіфікацыйных схем: МПК, МКТЗ, МКС, якія значна адрозніваюцца ад вядомых ББК і УДК. Тэхнічны бар’ер будзе праяўляцца ў складанасці пошуку такіх дакументаў як для бібліятэкараў, так і для чытачоў. Псіхалагічны бар’ер узнікае, калі рэцыпіент не разумее зместу дакумента, што звязана з асаблівасцю мовы навукова-тэхнічных дакументаў ці недастатковай яго падрыхтаванасцю для карыстання дакументам (узровень адукацыі, веданне замежных моў). Сацыяльны бар’ер звязаны з недаступнасцю дакумента для пэўных катэгорый карыстальнікаў: калі

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

дакумент мае грыф “для службовага карыстання”; калі тэкст заяўкі на прамысловы аб’ект не даступны да моманту яго рэгістрацыі; калі для выкарыстання неапублікаванага дакумента распрацаваны асобыя ўмовы доступу.

Такім чынам, навукова-тэхнічныя дакументы з’яўляюцца элементам дакументнай камунікатыўнай дзейнасці, выконваюць сутнасныя і прыкладныя функцыі, маюць характэрныя рысы і відавы склад, звязаны з асаблівасцямі камунікатыўнага працэсу ў навуковай і вытворчай сферах.


1. *Зиновьева, Н.Б.* Документоведение: учеб.-метод. пособие / Н.Б.Зиновьева. – М.: Профиздат, 2001. – 231 с.

2. *Зусьман, О.М.* Документоведение: учеб. пособие / О.М.Зусьман, В.А.Минкина. – СПб.: СПбУКИ, 2003. – 106 с.

3. *Кушнаренко, Н.Н.* Документоведение: учеб. / Н.Н.Кушнаренко.– 2-е изд., перераб. и доп. – Киев: Знання, 2000. – 460 с.

4. *Ларьков, Н.С.* Документоведение: учеб. пособие / Н.С.Ларьков. – М.: Восток-Запад, 2006. – 428 с.

5. *Плешкевич, Е.А*. Определение функций документа / Е.А.Плешкевич // Науч. и техн. б-ки, 2006. – № 6. – С. 46–53.

6. *Соколов, А.В.* Метатеория социальной коммуникации / А.В.Соколов. –СПб.: РНБ. – 350 с.

7. *Швецова-Водка, Г.Н.* Функции и свойства документа в системе социальных коммуникаций / Г.Н.Швецова-Водка // Книга: исследования и материалы. – М., 1994.– Вып. 69. – С. 69–96.


БИБЛИОТЕКА БГУКИ